ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

А.М.Карлюкевіч
2020 г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб рэспубліканскім творчым конкурсе ”Пад знакам Года малой радзімы!”

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак правядзення рэспубліканскага творчага конкурсу ”Пад знакам Года малой радзімы!” (далей – конкурс).

2. Асноўнымі мэтамі конкурсу з’яўляюцца:

рэалізацыя задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў развіцці рэгіёнаў краіны;

фарміраванне павагі да “малой радзімы”, уклад у яе развіццё, паказ яркіх дасягненняў па зберажэнню і адраджэнню роднага краю;

садзейнічанне выхаванню ў моладзі патрыятызму і любові да Радзімы праз паняцце “малая радзіма”, фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі маладога пакалення краіны.

3. Конкурс праводзіцца ў 2019 – 2020 годзе.

4. Арганізатар конкурсу – Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (далей – Міністэрства інфармацыі).

5. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў сродках масавай інфармацыі (далей – СМІ) і на афіцыйным сайце Міністэрства інфармацыі (www.mininform.gov.by).

6. На конкурс прадстаўляюцца матэрыялы, апублікаваныя ў друкаваных СМІ, сеткавых выданнях і на Інтэрнэт-рэсурсах, альбо якія выйшлі ў эфір тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ, на працягу 2019 года.

7. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

**Катэгорыя I – рэспубліканскія друкаваныя СМІ:**

”Землякі“;

”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;

”У Год малой радзімы – вялікія справы“;

”Малая радзіма – у фотаздымках“.

**Катэгорыя II – рэгіянальныя друкаваныя СМІ:**
”Землякі“;
”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы“;
”Малая радзіма – у фотаздымках“.
**Катэгорыя III – рэспубліканскія электронныя СМІ:**
”Землякі“;
”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы”.
**Катэгорыя IV – рэгіянальныя электронныя СМІ:**
”Землякі“;
”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы”.
**Катэгорыя V – Інтэрнэт-рэсурсы і сеткавыя выданні:**
”Землякі“;
”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы“;
”Малая радзіма – у фотаздымках“.

8. Да ўдзелу ў конкурсе падаюцца:

заяўка на ўдзел у рэспубліканскім творчым конкурсе ”Пад знакам Года малой радзімы!“ па форме згодна з дадаткам да гэтага Палажэння;

апублікаваныя матэрыялы (арыгіналы альбо ксеракопіі), матэрыялы, якія выйшлі ў эфір тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ (на электронных носьбітах), фотаматэрыялы (на папяровых носьбітах).

9. Конкурсныя матэрыялы з паметкай ”На конкурс“ не пазней 15 ліпеня 2020 года накіроўваюцца ў Міністэрства інфармацыі па адрасе: 220004, г.Мінск, пр.Пераможцаў, 11.

10. Пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі вызначае журы конкурсу, персанальны склад якога зацвярджаецца загадам Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца яго старшынёй.

11. Журы вызначае пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі Міністэрства інфармацыі 1, 2 ступені. Па рашэнні журы найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу могуць быць адзначаны спецыяльнымі дыпломамі.

12. Інфармацыя аб выніках і пераможцах конкурсу, даце і месцы правядзення ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў размяшчаецца ў СМІ і на афіцыйным сайце Міністэрства інфармацыі (www.mininform.gov.by).